# ПАДРУЧНІК «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Шурко Марыя Мікалаеўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Найбольш інтэнсіўнае развіццё асобы ў школьныя гады адбываецца пры арганізацыі яе актыўнай пазнавальнай дзейнасці. Для ажыццяўлення пазнавальнай дзейнасці неабходна фарміраванне матываў дзейнасці. Самым значным матывам навучання з’яўляецца пазнавальная цікавасць. Значыць, актывізацыю пазнавальнай дзейнасці трэба пачынаць з прабуджэння пазнавальнай цікавасці пры дапамозе спецыяльна падабраных формаў і метадаў.

Якія магчымасці падручніка ў выхаванні пазнавальнай актыўнасці вучняў? Што дае выкарыстанне пазнавальных праблем для рэалізацыі падручнікам яго асноўных функцый? Па-першае, пазнавальныя праблемы даюць магчымасць далучыць вучняў да працэсу пошуку і «адкрыцця» новых ведаў, уменняў, спосабаў творчай дзейнасці. Па-другое, пастаноўка перад вучнямі разнастайных пазнавальных праблем стварае ўмову для якаснай дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу. Па-трэцяе, рашэнне вучнямі пазнавальных праблем, крыніцай якіх выступае іх асабісты жыццёвы вопыт, спрыяе разуменню патрэбнасці, важнасці, мэтазгоднасці вывучэння прадмета. Па-чацвёртае, пазнавальныя праблемы могуць паспяхова выконваць функцыю своеасаблівага сістэматызатара. Гэта адбываецца тады, калі вучні далучаюцца да працэсу ўстанаўлення сувязяў паміж рознымі фактамі, з’явамі, паняццямі, заканамернасцямі. Вядома, што чым больш новы матэрыял звязаны з засвоеным раней, тым ён больш цікавы для вучняў. Па-пятае, цяжкі, але даступны характар праблем не толькі фарміруе цікавасць вучняў да таго, што яны вывучаюць, але і пэўную настойлівасць у вырашэнні пазнавальных задач. Па-шостае, пазнавальныя праблемы – гэта цудоўны спосаб самаправеркі, калі крытэрыем якасці адукацыі выступае не працэс («я вучыў»), а вынік («я вырашыў праблему»). Па-сёмае, сама прырода пазнавальных праблем фарміруе ў вучняў асобыя адносіны да зместу адукацыі, якая выступае перад імі не ў выглядзе застылых пастулатаў, а ў якасці структуры, якая дынамічна развіваецца. Па-восьмае, рашэнне пазнавальных праблем – гэта і падстава да ўстанаўлення адносін супрацоўніцтва паміж настаўнікам і вучнямі.

Развіццё пазнавальнай цікавасці да вывучэння беларускай мовы – гэта асноўная накіраванасць прадмета, якая забяспечвае магчымасць фарміраваць у вучняў несупярэчлівае ўяўленне пра сістэму і структуру мовы, звярнуць іх увагу на моўныя факты, якія цікавыя длямалодшых школьнікаў.

Фарміраванне пазнавальнай дзейнасці напрамую звязана з арганізацыяй адукацыйнага працэсу. Рубрыкі, якія прапануюцца ў падручніку,

дапамагаюць настаўніку ў гэтым. Вучні – раўнапраўныя ўдзельнікі навучання, яны, як і настаўнік, адказваюць за свае поспехі і недахопы. Настаўнік павінен садзейнічаць развіццю актыўнасці і самастойнасці малодшых школьнікаў на ўсіх этапах навучання, каб вучні маглі прымаць вучэбную задачу, удзельнічаць у выбары сродкаў яе рашэння, ажыццяўляць кантроль і самакантроль. Іх удзел у адукацыйным працэсе заключаецца не ў прыняцці гатовага ўзору, а ў выказванні прапаноў, абмеркаванні найбольш мэтазгодных спосабаў адказу на пытанне «Як рашыць вучэбную задачу?» Адсюль яшчэ адзін важны сродак у фарміраванні пазнавальнай дзейнасці – гэта асоба настаўніка ў парадыгме вучэбнага супрацоўніцтва. Праца ў парах, групах садзейнічае развіццю здольнасці разумець і ўлічваць інтэлектуальную пазіцыю іншага чалавека. Падручнік настаўніку і вучням дапамагае вызначыць неабходнасць такой працы.

Яшчэ адным важным сродкам у фарміраванні пазнавальнай дзейнасці з'яўляецца дыферэнцыяцыя навучання, якая разглядаецца як магчымасць індывідуалізацыі навучання ва ўмовах аднаго класа. Распрацавана многа розных методык дыферэнцаванага навучання, але ўсе яны датычацца ў асноўным аб'ёму прапануемага вучням матэрыялу: «моцным» дзецям настаўнік дае больш заданняў, чым «слабым». Але такое рашэнне праблемы не здымае саму праблему: здольныя вучні затрымліваюцца ў сваім развіцці, а «слабыя» не могуць пераадолець цяжкасцяў, якія ўзнікаюць пры рашэнні вучэбнай задачы. У падручніку «Беларуская мова» І.І. Паўлоўскага (4 клас) прапануюцца заданні, падабраныя па прынцыпе «больш цяжкае – больш лёгкае».

У падручніку «Беларуская мова» закладзены важныя сродкі для фарміравання пазнавальнай дзейнасці вучняў: 1) навуковасць і лагічнасць падачы матэрыялу на аснове мыслення і ўяўлення; 2) арганізацыя адукацыйнага працэсу; 3) формы супрацоўніцтва; 4) алгарытмізацыя і мадэляванне; 5) прынцып дыферэнцыяцыі.

Напрыканцы другой чвэрці ў 4 класе была праведзена кантрольная праца, якая ўключала чатыры групы заданняў: першая група заданняў правярала, наколькі асэнсоўваюць вучні засвоеныя імі веды і як выкарыстоўваюць іх у стандартнай сітуацыі. Па гэтай групе клас набраў 55,7%; другая група заданняў правярала, як вучні ўмеюць выкарыстоўваць свае веды ў новай, незвычайнай для іх, нестандартнай сітуацыі. Па гэтай групе заданняў клас набраў 59,4%; трэцяя група заданняў высвятляла, наколькі навучанне садзейнічала агульнаінтэлектуальнаму развіццю вучняў і станаўленню іх пазнавальнай дзейнасці. Па гэтай групе клас набраў 63,1%; чацвёртая група дазваляла меркаваць пра агульны ўзровень моўнага развіцця вучняў, пра ўзровень іх моўнай кампетэнцыі. Па гэтай групе клас набраў 78,2%.

Таксама малодшым щкольнікам былі прапанаваны фразы для анкетавання: «Я даведаўся, што….», Новым для мяне стала…», «Я ўпэўніўся,

што…», «Я адкрыў для сябе…», «Мне спадабалася…». 62,8% вучняў чацвёртага класа адказалі, што ім на ўроках беларускай мовы цікава, пазнавальна. Вось прыклады некаторых дапісаных фраз: «Я ўпэўніўся, што беларуская мова прыгожая», «Я ўпэўнілася, што ў беларускай мове шмат пазнавальнага», «Мне спадабалася вывучаць беларускую мову з дапамогай цікавых заданняў і практыкаванняў».

Намі была прапанавана анкета для бацькоў. У яе былі ўключаны пытанні, якія даюць уяўленне пра пазнавальную дзейнасць вучняў. На пытанне «Ці часта я чую пра ўрокі беларускай мовы ад дзіцяці?» адказалі: 1) было цікава – 30,8%; было сумна – 1,7%; было цяжка, але цікава – 65,1%; я сам адкрыў ці мы адкрылі спосаб – 3,7%; я сам знайшоў памылку – 26,6%.

На пытанне «Ці часта маё дзіця выконвае дамашняе заданне па беларускай мове?» адказалі: 1) з жаданнем – 29,8%; 2) з цікавасцю – 30,1%; 3) самастойна і правільна – 32,3%; 4) з нежаданнем – 2,7%; 5) робіць у апошнюю чаргу – 14,3%.

Такім чынам, з вышэйпрыведзеных матэрыялаў можна зрабіць вывад, што ў падручніку «Беларуская мова» І.І. Паўлоўскага закладзены важныя сродкі для фарміравання пазнавальнай дзейнасці малодшых школьнікаў.